ПА ЗАЛАХ МУЗЕЯЎ

# Старонкі гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці

Гераічная абарона невялікім гарнізонам Совецкай Арміі старадаўняй рускай крэпасці на беразе Заходняга Буга ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца ўзорам бяспрыкладнай мужнасці, стойкасці і гераізму совецкіх людзей, прыкладам беззаветнага служэння Радзіме і справе Комуністычнай партыі.

Нядаўна на тэрыторыі крэпасці, у будынку інжынернай казармы, дзе ў час баёў размяшчаўся штаб абароны, створан музей гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці. У сямі яго залах сабраны дакументы, зброя, амуніцыя, скульптуры і карціны совецкіх мастакоў і іншыя матэрыялы, якія расказваюць аб легендарным подзвігу совецкіх воінаў, аб мужнасці і стойкасці бессмяротнага гарнізона.

У першай зале музея можна азнаёміцца з мінулым горада Брэста, з гісторыяй будаўніцтва крэпасці. Яна, як сведчаць дакументы, схемы і карты, была пабудавана ў 1830—1842 гадах для прыкрыцця заходніх рубяжоў Расіі і па свайму часу з'яўлялася выдатным у інжынерных адносінах збудаваннем.

Экспазіцыі наступных двух залаў расказваюць аб жыцці і баявой вучобе гарнізона крэпасці напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, аб першых днях баёў у крэпасці, аб выключнай стойкасці совецкіх пагранічнікаў.

Пагранічнікі 9-й заставы, акруговай школы шафёраў пагранвойск і іншыя падраздзяленні першымі прынялі на сябе ўдар нямецка-фашысцкіх полчышчаў. Вось перад намі фатаграфіі ўмацаванняў, якія абаранялі пагранічнікі. Да апошняга часу аб гэтым эпізодзе абароны амаль нічога не было вядома. Нядаўна супрацоўнікам музея ўдалося ўстанавіць сувязь з былым радавым акруговай школы шафёраў пагранвойск М. І. Мясніковым, які з групай воінаў-пагранічнікаў змагаўся ў крэпасці да 5 ліпеня. Ён расказаў, што імі камандаваў масквіч малодшы лейтэнант Жданаў. Не адна сотня гітлераўцаў знайшла сабе смерць на подступах да ўмацаванняў, на абстрэльваемай пагранічнікамі пераправе цераз раку Заходні Буг. Калі скончыліся боепрыпасы, а колькасць абаронцаў умацавання зменшылася да 8 чалавек, воіны вырваліся з варожага кальца.

У цэнтральнай зале экспануюцца матэрыялы, якія расказваюць аб арганізацыі абароны цытадэлі і яе кіраўніках. На трэці дзень баёў, калі становішча стала асабліва сур'ёзным, па прапанове палкавога камісара Фаміна адбылася нарада камандзіраў, якія кіравалі баямі ў цэнтры крэпасці. На ёй быў напісан вядомы «Загад № 1», знойдзены ў 1950 годзе ў планшэце непазнанага загінуўшага афіцэра. З гэтага дакумента відаць, што на чале абароны крэпасці былі пастаўлены найбольш вопытныя камандзіры. Агульнае кіраўніцтва баямі было ўскладзена на намесніка камандзіра палка—удзельніка грамадзянскай вайны капітана Івана Нікалаевіча Зубачова. Яго намеснікам стаў палкавы камісар Ефім Маісеевіч Фамін. Пасля гібелі членаў штаба абароны жорсткія баі ў крэпасці, паступова затухаючы, працягваліся да другой паловіны ліпеня. Глыбока хвалююць патрыятычныя надпісы, пакінутыя невядомымі воінамі на сценах крапасных збудаванняў: «Памром, але з крэпасці не пойдзем», «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма. 20 ліпеня 1941 года».

У ліку дакументаў у музеі захоўваецца абгарэлы комсамольскі білет № 0957174 лейтэнанта А. Ф. Наганава. Камандзір 1-га ўзвода комсамолец Наганаў 22 чэрвеня быў дзяжурным па палку і пры нападзе ворага неадкладна прыняў меры па захаванню дакументаў штаба і баявога сцяга часці, арганізаваў абарону ля Тэрэспальскіх варот. Астанкі Наганава разам з целамі 14 іншых байцоў і камандзіраў, якія загінулі ў першыя дні вайны, былі знойдзены ў руінах Тэрэспальскіх варот толькі ў 1949 годзе.

У поўночнай частцы крэпасці стойка супраціўляўся Усходні форт, абаронай якога кіраваў комуніст маёр Пётр Міхайлавіч Гаўрылаў, цяпер Герой Совецкага Саюза. Некалькі разоў фашыстам здавалася, што яны ўжо зламалі супраціўленне абаронцаў форта, але пры кожнай новай атацы яны зноў і зноў натыкаліся на агонь совецкіх воінаў. Барацьба працягвалася да 12 ліпеня—дня, калі гітлераўцы, нарэшце, авалодалі фортам. Тыя, што засталіся ў жывых, не здаліся ворагу, а, паводле наяўных у нас даных, працягвалі барацьбу з ворагам да 24—27 ліпеня, схаваўшыся ў падзямеллях Кобрынскага ўмацавання.

Да дакументаў, фатаграфій, зброі абаронцаў форта прыбавіўся баявы сцяг 393 ОЗАД, які ў цяжкую мінуту бою схаваў у адным з казематаў Усходняга форта малодшы сержант Р. К. Семянюк. Праз 15 год Семянюк, цяпер рабочы Кузнецкага металургічнага камбіната, прыехаў у Брэст і знайшоў захаваную ім рэлікві. За высокі воінскі подзвіг Р. К. Семянюк узнагароджан ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга.

На матэрыялах і дакументах музея совецкія людзі вучацца яшчэ больш любіць нашу совецкую Радзіму, беражліва захоўваць яе вялікія заваяванні, у імя якіх пралілі сваю кроў Героі Вялікай Айчыннай вайны.

**Капітан А. Крупеннікаў,**
начальнік музея
гераічнай абароны
Брэсцкай крэпасці.



НА ЗДЫМКУ: *Холмскія вароты Брэсцкай крэпасці.*
*Фота В. Германа.* БЕЛТА.